БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

Аб’ект аўтарскага права
УДК 882.6.09(091)(476)

БАТУРЫНА
Алена Львоўна

# СТАНАЎЛЕННЕ РАМАНТЫЧНЫХ ПРЫНЦЫПАЎ У БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XIX СТАГОДДЗЯ І ТРАДЫЦЫІ НЯМЕЦКАГА РАМАНТЫЗМУ

Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура

Мінск, 2024

Работа выканана ва ўстанове адукацыі
«Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны»

**Навуковы кіраўнік:** **Штэйнер Іван Фёдаравіч**,
доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускай літаратуры
УА «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны»

**Афіцыйныя апаненты:** **Хмяльніцкі Мікалай Мікалаевіч**,
доктар філалагічных навук, дацэнт,
загадчык кафедры кітайскай філалогіі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

**Багдановіч Ірына Эрнстаўна,**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
старшы навуковы супрацоўнік
аддзела тэорыі і гісторыі літаратуры
Інстытута літаратуразнаўства імя Я. Купалы
ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі»

**Апаніруючая арганізацыя:** УА «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт»

Абарона адбудзецца 26 красавіка 2024 г. у 12.00 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.12 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце (220030, г. Мінск, вул. К. Маркса, 31, філалагічны факультэт, аўд. 62); e-mail вучонага сакратара: tsidorova1980@mail.ru; тэл. вучонага сакратара: 8 (017) 209-55-58.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Аўтарэферат разасланы «21» сакавіка 2024 г

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый Т.П.Сідарава

# УВОДЗІНЫ

Рамантызм XIX ст. -- магутны па маштабах і прадуктыўнасці сацыякультурны феномен, які здолеў акумуляваць у сваёй мастацкай прасторы літаратурныя традыцыі і ідэі розных напрамкаў і эпох. У кожнай нацыянальнай культуры элементы і традыцыі рамантызму зведалі трансфармацыі, па-рознаму ўдзельнічалі ў выпрацоўцы новых каштоўнасных уяўленняў. Традыцыі, імпульсы, якія ідуць ад рамантызму, дагэтуль захавалі актуальнасць у літаратурным працэсе. Нямецкі рамантызм – выбітная культурная з’ява, якая ў значнай ступені сфарміравала інтэлектуальны дыскурс Еўропы XIX–XX стст. У цэнтры ўвагі рамантыкаў знаходзіцца феномен чалавека, іх цікавяць унутраныя праблемы і патаемныя глыбіні чалавечай душы. Філасофскай асновай рамантызму стаў нямецкі ідэалізм І.Г. Фіхтэ, Ф. Шэлінга, Ф. Шлеермахера. Значны ўплыў на развіццё еўрапейскай літаратуры азначанага кірунку мелі тэарэтычныя працы А. В. Шлегеля, творчасць пісьменнікаў-рамантыкаў Л. Ціка, Наваліса, Э.Т.А. Гофмана і інш.

Рамантызм заклаў асновы будучых магістральных ідэйных напрамкаў развіцця беларускай літаратуры – усведамлення і сцвярджэння самабытнасці беларускай нацыі, выпрацоўкі канцэпцыі нацыянальнага шляху, вербалізацыі поглядаў беларуса на свет і чалавека. У дысертацыйным даследаванні выкарыстаны *канцэпцыя падоўжанага рамантызму* (У. Казбярук, Л. Тарасюк, У. Мархель, І. Багдановіч, І. Запрудскі, І. Штэйнер і інш.) і *канцэпцыя польскамоўнай плыні* ў літаратуры Беларусі (М. Багдановіч, А. Мальдзіс, У. Мархель, У. Казбярук, В. Каваленка, М. Хмяльніцкі, І. Штэйнер і інш.). Матэрыялам стала як беларуска-, так і польскамоўная літаратура пісьменнікаў – ураджэнцаў Беларусі XIX ст., таму што без уліку другога са згаданых складнікаў гісторыя развіцця рамантычкага кірунку ў прыгожым пісьменстве Беларусі будзе скажонай. У апошнія дзесяцігоддзі беларускія літаратуразнаўцы актыўна займаюцца праблемай суаднесенасці рамантычнай плыні беларускай літаратуры з еўрапейскім рамантызмам (працы У. Мархеля, Ж. Шаладонавай, А. Данільчык, С. Мінскевіча, А. Вальчук, Т. Барысюк і інш.), аднак дагэтуль адсутнічае сістэмнае даследаванне спецыфікі станаўлення рамантычнага прынцыпу адлюстравання рэчаіснасці ў беларускай літаратуры XIX ст. і ўзаемасувязей гэтага працэсу з нямецкімі літаратурнымі кірункамі канца XVIII–пачатку XIX ст.

**Актуальнасць** вывучэння ролі традыцый нямецкага рамантызму ў станаўленні рамантычных прынцыпаў у беларускай літаратуры XIX стагоддзя абумоўлена наступнымі фактарамі:

– зваротам да таго знакавага перыяду ў развіцці беларускай літаратуры, калі адбывалася станаўленне новай беларускай літаратуры, закладваліся яе ідэалагічныя і мастацкія прынцыпы;

– недастатковай распрацаванасцю канцэпцыі рамантызму ў дачыненні да шматмоўнай літаратуры Беларусі XIX ст., што негатыўным чынам уплывае на цэласнае ўспрыманне літаратурнага працэсу;

– неабходнасцю комплекснага даследавання літаратурных з'яў у Беларусі XIX ст. з улікам папулярнасці ва Усходняй Еўропе і ў Расіі рамантычнай літаратуры Германіі.

Даследаванне, праведзенае ў названым ракурсе, будзе спрыяць выяўленню агульных заканамернасцей развіцця нацыянальнай літаратуры як адметнай часткі сусветнай, – тым болей што абавязковае вывучэнне твораў буйнейшых пісьменнікаў-рамантыкаў свету прадугледжана праграмамі курсаў беларускай літаратуры як для вучняў сярэдніх школ, так і для студэнтаў філалагічных факультэтаў устаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

### Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі

Дысертацыйнае даследаванне выканана на кафедры беларускай літаратуры ўстановы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны» адпаведна заданню 6.1.05 «Паэтыка беларускай літаратуры: жанр, сюжэт, кампазіцыя» НДР ДПФД «Беларуская літаратура як сацыякультурны феномен: мастацкія дамінанты, жанравы генезіс» (№ дзяржрэгістрацыі 20212242 ад 04.06.21) падпраграмы «Беларуская мова і літаратура» дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» на 2021–2025 гг.. Дысертацыя адпавядае прыярытэтным напрамкам фундаментальных навуковых даследаванняў Рэспублікі Беларусь на 2021–2025 г.г. (п. 6 «Забеспячэнне бяспекі чалавека, грамадства і дзяржавы»; Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 07.05.2020 №156).

### Мэта і задачы даследавання

**Мэта** дысертацыйнага даследавання – вызначыць асаблівасці станаўлення рамантычных прынцыпаў адлюстравання рэчаіснасці ў беларускай літаратуры XIX ст. і ролю традыцый класічнай нямецкай літаратуры ў гэтым працэсе.

Для дасягнення мэты неабходна вырашыць наступныя **задачы**:

1. Выявіць генезіс, светапоглядныя і тэарэтычныя асновы рамантычнай плыні ў шматмоўнай літаратуры Беларусі XIX ст.; раскрыць значэнне нямецкіх тэарэтыка-эстэтычных канцэпцый рамантызму канца XVIII – пачатку XIX стст. у абазначаным працэсе.

2. Вызначыць падабенства, аналогіі і спецыфічныя асаблівасці эвалюцыі балады і зборніка апавяданняў з рамачнай кампазіцыяй як значымых жанраў рамантычнага кірунку ў нямецкай літаратуры канца XVIII– першай паловы XIX стст. і ў шматмоўнай літаратуры Беларусі XIX ст.

3. Вылучыць спецыфіку мастацкай рэалізацыі хрысціянскага светапогляду як вызначальнага элемента рамантычнай ідэалогіі ў нямецкім мастацтве слова і ў шматмоўнай літаратуры Беларусі XIX ст.

4. Ахарактарызаваць асаблівасці засваення нямецкімі і беларускімі рамантыкамі народнай песеннай спадчыны; вызначыць спосабы рэалізацыі мастацка-эстэтычных прынцыпаў рамантыкаў пры звароце да тэмы музыкі; ахарактарызаваць вобраз муз*ы*кі (песняра) як характэрнага героя літаратуры рамантычнага кірунку.

5. Устанавіць асноўныя крыніцы і функцыі ключавых фантастычных вобразаў-сімвалаў у беларускай і нямецкай літаратуры рамантызму; выявіць іх нацыянальную спецыфіку і эвалюцыю.

**Аб'ект і прадмет даследавання**

У якасці аб'екта даследавання абраны творы беларуска- і польскамоўных пісьменнікаў Беларусі XIX ст. з элементамі рамантычнай эстэтыкі, а таксама класічныя ўзоры нямецкай літаратуры XVIII – XIX стст.

Прадмет даследавання – мастацкая рэалізацыя ў літаратуры Беларусі XIX ст. асноўных тэарэтыка-эстэтычных і зместава-фармальных прынцыпаў, аналагічных прынцыпам нямецкага перадрамантызму і рамантызму.

**Метадалогія** даследавання носіць комплексны характар. Тэарэтычнай асновай дысертацыі сталі працы В. Жырмунскага, Н. Бяркоўскага, Ф. Фёдарава, В. Рагойшы, У. Мархеля, С. Мусіенка, М. Хмяльніцкага, А. Гугніна, І. Штэйнера і інш. Пры правядзенні дысертацыйнага даследавання выкарыстаны распрацоўкі з тэорыі і методыкі параўнальна-гістарычнага, культурна-гістарычнага, апісальнага аналізу тэкстаў, асобныя элементы біяграфічнага і сацыялагічнага метадаў.

**Навуковая навізна**

У дысертацыі ўпершыню:

– вылучаны і сістэматызаваны кантактныя сувязі паміж нямецкай перадрамантычнай і рамантычнай літаратурай і шматмоўнай літаратурай Беларусі XIX ст.;

– выяўлена роля найбольш значных узораў нямецкай тэарэтыка-эстэтычнай і мастацкай літаратуры XVIII – XIX стст. у фарміраванні рамантычнага кірунку ў літаратуры Беларусі XIX ст.;

– раскрыта роля нямецкай класічнай літаратуры ў фарміраванні жанраў рамантычнай балады і зборнікаў апавяданняў з рамачнай кампазіцыяй у літаратуры Беларусі;

– вылучаны агульныя і адметныя рысы ва ўвасабленні беларускімі і нямецкімі аўтарамі характэрных рамантычных вобразаў;

– вызначаны мастацкія дамінанты літаратуры Беларусі XIX ст. з элементамі рамантычнай эстэтыкі.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Сыходжанні паміж нямецкім нацыянальна арыентаваным рамантызмам і рамантызмам у гетэрагеннай культуры шматмоўнай літаратуры Беларусі XIX ст. абумовіла творчае засваенне інтэлектуальных дасягненняў «Буры і націску» і Веймарскай класікі, а таксама філасофска-эстэтычных канцэпцый, вылучаных Ё.Г. Гердэрам і А.В. Шлегелем. Канфлікт паміж ідэаламі і рэальнасцю, немагчымасць вырашыць сацыяльна-палітычныя праблемы рэвалюцыйнымі метадамі стварылі спрыяльныя ўмовы для рэцэпцыі прадстаўнікамі шматмоўнай літаратуры Беларусі нямецкіх тэарэтыка-эстэтычных канцэпцый канца XVIII – пачатку XIX стст.

2. Рамантызм у айчыннай літаратуры і нямецкі нацыянальна арыентаваны рамантызм зблізкаюць засяроджанасць на маральна-этычных праблемах, патрыятычны пафас, засваенне народнай духоўнай спадчыны, а таксама падабенства эвалюцыі «галоўнага» жанру рамантызму – балады, створанай у гэты час, і новае адкрыццё класічнай формы – зборніка з рамачнай кампазіцыяй. Аналогіі паміж творамі прадстаўнікоў шматмоўнай літаратуры Беларусі (балады Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, А. Рыпінскага, зборнік Я. Баршчэўскага «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях») і творчасцю як прадстаўнікоў нямецкай перадрамантычнай літаратуры, так і нацыянальна арыентаваных рамантыкаў праяўляюцца на светапоглядным, ідэйным, сюжэтным, матыўным узроўнях.

3. Агульнай характарыстыкай рамантычнага кірунку як у нямецкай, так і ў шматмоўнай літаратуры Беларусі XIX ст. з'яўляецца адчуванне прысутнасці Бога ва ўсіх праявах жыцця. Сувязь рамантызму з рэлігіяй яскрава праяўляецца ў хрысціянізаваным характары ідэі аб народным духу, у міфалагеме Залатога веку, матывах грэхападзення і шляху да Бога праз пакаянне.

4. Мастацка-эстэтычныя пазіцыі рамантыкаў яскрава ўвасабляюцца праз зварот да тэмы музыкі як вышэйшай формы духоўнай дзейнасці чалавека. Засваенне народнай песні надае новыя імпульсы для развіцця нацыянальных літаратур. У рамках рамантычнага кірунку ў нямецкай літаратуры склаўся вобраз муз*ы*кі, які знаходзіцца ў апазіцыі да грамадства; у шматмоўнай літаратуры Беларусі XIX ст. – вобраз муз*ы*кі (песняра), які выказвае надзеі і спадзяванні народа.

5. Выкарыстанне фантастыкі дазволіла рамантыкам пераадолець абмежаванасць рацыянальнага светаўспрымання. Характэрнай асаблівасцю рамантызму стала сістэма фантастычных вобразаў, якія атрымалі і ўзбуйнілі сваё сімвалічнае значэнне з дапамогай аўтарскай інтэрпрэтацыі ўласцівых архаічнай свядомасці ўяўленняў (вобразы гор, лесу, вады і іх насельнікаў, чараўнікоў). Нацыянальнай спецыфікай функцыянавання фантастычных вобразаў у рамантычнай літаратуры Беларусі XIX ст. з'яўляецца актыўнае перайманне элементаў беларускіх казак і паданняў, якое спалучалася з арыентацыяй на хрысціянскія каштоўнасці і традыцыйную мараль.

**Асабісты ўклад саіскальніка**

Дысертацыйнае даследаванне выканана самастойна. Упершыню ў беларускім літаратуразнаўстве праведзена параўнальна-супастаўляльнае вывучэнне рамантычных прынцыпаў адлюстравання рэчаіснасці ў шматмоўнай літаратуры Беларусі XIX ст. і нямецкай літаратуры канца XVIII – першай паловы XIX стст. Надрукаваныя артыкулы напісаны цалкам самастойна, без сааўтараў.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Прамежкавыя і канчатковыя вынікі даследавання прайшлі апрабацыю на 13 міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях: VI Міжнародныя навуковыя чытанні, прысвечаныя памяці народнага пісьменніка Беларусі акадэміка І.Я. Навуменкі «Рэгіянальнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў літаратуры» (Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны, 2–3 кастрычніка 2018 г.); VIII Международная науч.-практ. конференция «Актуальные проблемы романо-германской филологии и методики преподавания иностранных языков» (Гомель, ГГУ им. Ф. Скорины, 26 октября 2018 г.); I Международная научно-практическая конференция «Язык и межкультурная коммуникация: современные векторы развития» (Пинск, ПолесГУ, 12 апреля 2019 г.); IX Международная научно-практическая конференция «Актуальные проблемы романо-германской филологии и методики преподавания иностранных языков» (Гомель, ГГУ им. Ф. Скорины, 25 октября 2019 г.); Міжнародная навуковая канферэнцыя «Скарынавы запаветы і сучаснасць. Да 95-годдзя з дня нараджэння прафесара У.В. Анічэнкі» (Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны, 22 лістапада 2019 г); VII Міжнародныя навуковыя чытанні, прысвечаныя памяці народнага пісьменніка Беларусі акадэміка І.Я. Навуменкі «Рэгіянальнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў літаратуры» (Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны, 8–9 кастрычніка 2020 г.); X Международная научно-практическая конференция «Актуальные проблемы романо-германской филологии и методики преподавания иностранных языков»; II Международная научно-практическая конференция «Язык и межкультурная коммуникация: современные векторы развития» (Пинск, ПолесГУ, 26 марта 2021 г.);

XIII Міжнародная навуковая канферэнцыя «Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай», прысвечанай 100-годдзю БДУ і 90-годдзю з дня нараджэння члена-карэспандэнта НАН Беларусі прафесара А.А. Лойкі (Мінск, БДУ, 28–30 кастрычніка 2021 г.); II Міжнародная навуковая канферэнцыя «Нацыянальны характар і спосабы яго ўвасаблення ў культуры і мове ва ўмовах мульцікультурнага асяроддзя» (Полацк, ПДУ імя Еўфрасінні Полацкай, 24–25 сакавіка 2022 г.); I Международная научная конференция «Гугнинские чтения», (Полоцк, ПГУ им. Ефросинии Полоцкай, 5–6 мая 2022 г.); VIII Міжнародныя навуковыя чытанні «Рэгіянальнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў славянскіх літаратурах», прысвечаныя памяці народнага пісьменніка Беларусі, акадэміка І.Я. Навуменкі (Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны, 4–5 кастрычніка 2022 г.); Міжнародная навуковая канферэнцыя «Трэція Кісялёўскія чытанні “На раздарожжы: рознаскіраваныя дыскурсы ў беларускай літаратуры XIX–XX стст.”» (да 225-годдзя А. Міцкевіча і 215-годдзя В. Дуніна-Марцінкевіча) (Мінск, НАН Беларусі, 20 красавіка 2023 г.).

Пра апрабацыю сведчыць Акт укаранення вынікаў даследавання ў адукацыйны працэс установы адукацыі «ГДУ імя Ф. Скарыны» ад 18.10.2021. Матэрыялы даследавання знайшлі практычнае прымяненне ў курсах «Гісторыя беларускай літаратуры XIX ст.», «Замежная літаратура», якія чытаюцца для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі спецыяльнасці «Беларуская філалогія».

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Асноўны змест дысертацыйнага даследавання адлюстраваны ў 26 публікацыях: 7 артыкулаў апублікаваны ў навуковых выданнях, рэкамендаваных ВАК (3,3 аўт. арк.), 9 – у навуковых зборніках (3,6 аўт. арк.), 10 − у зборніках навуковых канферэнцый (4,4 аўт. арк.). Агульны аб’ём апублікаваных навуковых матэрыялаў – 11,3 аўт. арк.

**Структура і аб’ём дысертацыі**

Дысертацыйнае даследаванне складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі, 4 раздзелаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса (211 назваў, з іх 186 – спіс выкарыстаных крыніц, 26 – публікацыі саіскальніка вучонай ступені) і 2 дадаткаў. Аб’ём даследавання – 136 старонак, са спісам літаратуры і дадаткамі – 173 старонкі. Дадаткі займаюць 20 старонак. У дадатку А разгледжана эвалюцыя аднаго з галоўных вобразаў нямецкага рамантызму – «Wasserfrau» *‘воднай жанчыны’* (русалкі, ундзіны, сірэны, феі). У дадатку Б прыведзены арыгінальны тэкст крыніц, якія цытуюцца ў дысертацыі ў падрадковым аўтарскім перакладзе, а таксама каментары да асноўнага тэксту.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Раздзел 1 **«Нямецкія тэарэтыка-эстэтычныя канцэпцыі канца XVIII – пачатку XIX стагоддзяў і станаўленне рамантычнай плыні літаратуры Беларусі»** прысвечаны вызначэнню спецыфікі рамантызму ў нямецкай літаратуры і літаратуры Беларусі XIX ст., аналізу ўплываў і тыпалагічных сыходжанняў паміж нацыянальна арыентаваным нямецкім рамантызмам і рамантызмам у айчынным прыгожым пісьменстве, а таксама аналізу крыніц рэцэпцыі нямецкіх філасофска-эстэтычных канцэпцый канца XVIII – пачатку XIX стст.

У падраздзеле 1.1 **«Станаўленне рамантызму ў нямецкай літаратуры і літаратуры Беларусі XIX ст.»** адзначаецца, што рамантычны кірунак у літаратуры і мастацтве абодвух народаў стаў рэакцыяй на сацыяльна-палітычныя змены ў свеце і заклаў асновы будучых магістральных ідэйных напрамкаў развіцця нацыянальных літаратур. Характарызуюцца галоўныя этапы эвалюцыі нямецкага рамантызму (енскі, гейдэльбергскі перыяды, позні нямецкі рамантызм). Падкрэсліваецца, што ў шматмоўнай літаратуры Беларусі рамантызм як светапогляд і мастацкі кірунак нарадзіўся ў філаматцкім коле (А. Міцкевіч, Я. Чачот, Т. Зан і інш.) і на працягу ўсяго XIX ст. уплываў на характар прыгожага пісьменства. Асноўнымі праявамі рамантызму стала пашырэнне жанравага і стылёвага арсенала літаратуры, супрацьпастаўленне ідэальнага і рэальнага, арыентацыя на хрысціянскія каштоўнасці, увага да нацыянальнага мінулага, збліжэнне з вуснапаэтычнай творчасцю беларусаў, засваенне народнай фантастыкі. Асаблівасцю функцыянавання айчыннага рамантызму ў азначаны перыяд з’яўляцца яго сінкрэтычнае спалучэнне з асветніцкімі элементамі (Я. Чачот, Я. Баршчэўскі), рысамі сентыменталізму (В. Дунін-Марцінкевіч), рэалізму (У. Сыракомля, Ф. Багушэвіч), натуралізму (Ф. Багушэвіч). Я. Баршчэўскі здолеў з дапамогай вобразаў народнай фантастыкі стварыць міфалагізаваную карціну нацыянальнага мінулага. На характар беларускага рамантызму значна паўплывала творчасць народжанага на беларускай зямлі паэта-рамантыка А. Міцкевіча, які чэрпаў натхненне ў мясцовай гісторыі і народнай спадчыне.

Пераадоленне класіцызму ў літаратуры Беларусі суправаджалася ростам цікавасці да новых плыняў у еўрапейскім, у тым ліку нямецкім прыгожым пісьменстве. А. Міцкевіч, Я. Чачот, Ф. Малеўскі, А. Адынец, У. Сыракомля і інш. вывучалі нямецкую мову, каб атрымаць магчымасць знаёміцца з дасягненнямі нямецкай філасофскай і мастацкай думкі. У падраздзеле паказана, што фарміраванню ідэалогіі нацыянальна арыентаванага рамантызму як ў нямецкай літаратуры («гейдэльбергская суполка» і яе паслядоўнікі), так і ў прыгожым пісьменстве Беларусі спрыяла

засваенне інтэлектуальных дасягненняў нямецкага перадрамантызму і тэарэтыка-эстэтычных канцэпцый А. В. Шлегеля. Даследаванне карэспандэнцыі філаматаў, прадстаўленасці твораў нямецкіх аўтараў на тагачасным кніжным рынку і тэатральных сцэнах былой Рэчы Паспалітай, аналіз прадмовы А. Міцкевіча да зборніка «Балады і рамансы» (1822) сведчаць, што філаматы, якія заклалі падмурак рамантызму ў літаратуры Беларусі XIX ст., вывучалі мастацкую літаратуру і тэарэтычныя працы прадстаўнікоў «Буры і націску» і Веймарскай класікі (Ф. Шылера, Ё. В. Гётэ, Г. Бюргера, Ф. Г. Клапштока, Л. Хёльці, Ё. Гляйма), а таксама былі знаёмыя з філасофска-эстэтычнымі канцэпцыямі Ё. Гердэра (прынцыпамі роўнай вартасці культур і гістарызму) і А. В. Шлегеля. Канфлікт паміж ідэаламі і рэальнасцю, немагчымасць вырашыць сацыяльна-палітычныя праблемы рэвалюцыйнымі метадамі таксама стварылі спрыяльныя ўмовы для тыпалагічнага збліжэння мастацкіх і ідэалагічных пазіцый прадстаўнікоў шматмоўнай літаратуры Беларусі XIX ст. і нямецкіх рамантыкаў.

У падраздзеле 1.2 **«Рэалізацыя мастацкіх прынцыпаў рамантызму і жанрава-стылёвая эвалюцыя: уплывы і сыходжанні»** згодна з прынцыпам парытэтнасці даследуюцца агульныя і адметныя рысы характэрных жанраў беларускага і нямецкага рамантызму – балады і зборніка апавяданняў з рамачнай кампазіцыяй. На жанравым узроўні мастацкія прынцыпы рамантызму найбольш яскрава праявіліся у баладзе. У дысертацыі яе асаблівасці разглядаюцца на матэрыяле творчасці Я. Чачота (яскравага эксперыментатара і заснавальніка жанру ў новай літаратуры Беларусі) і Я. Баршчэўскага (творы якога па форме і змесце ўяўляюць сабой класічную літаратурную баладу). Таксама прадстаўлены параўнальны аналіз першай беларускамоўнай балады «Нячысцік» А. Рыпінскага і твора Ё. Хэбэля «Карбункул» на алеманскім дыялекце нямецкай мовы.

Балады Я. Чачота адпавядаюць класічнаму баладнаму тыпу, хаця вылучаюцца вольнасцю абыходжання з жанравым канонам, у чым праяўляецца рамантычны ўплыў на мастацкі метад аўтара. Іх сюжэты падчас налічваюць некалькі ліній, якія могуць разгортвацца паралельна, пераходзіць адна ў другую. Некалькі сюжэтных ліній могуць развівацца як кантрапункт, г.зн. паміж імі няма непасрэднай прычынна-выніковай сувязі, аднак разам яны складаюць ідэйна-эмацыйны і пачуццёва-вобразны змест мастацкага твора. Дыдактызм і крытыка грамадскіх заганаў набліжае гэтыя творы да нямецкіх перадрамантычных балад Ф. Шылера і Г. Бюргера, а шырокае выкарыстанне фальклору, гістарызм, патрыятычны пафас – да нямецкіх балад перыяду «высокага рамантызму». У баладах Я. Чачота можна знайсці шэраг паралеляў з творамі нямецкай літаратуры («Ленора» і «Дзікі паляўнічы» Г. Бюргера нарадзілі баладны вобраз «шалёных скокаў», алюзіі

на які ёсць у баладзе «Свіцязь». Кульмінацыйная сцэна свята ў палацы злачынцы ў баладзе «Свіцязь», падчас якога крывавая галава забітага героем купца патрабуе помсты, нагадвае сцэну з рамана прадстаўніка перадрамантызму Ф. М. Клінгера «Фауст»).

Балады Я. Баршчэўскага ў большай ступені, чым творчасць Я. Чачота, укаранёныя ў рамантычную літаратурную традыцыю, аб чым сведчыць схільнасць аўтара да двух баладных тыпаў, шырока прадстаўленых у нямецкай літаратуры, – жахлівай балады пра нябожчыкаў («Цэлесціна», «Роспач», «Курганы», «Партрэт») і прыродна-магічнай балады («Рыбак», «Фантазія», «Русалка», «Зарослае возера», «Дзве бярозы»). У баладах «Цэлесціна», «Роспач», «Курганы», «Помста» вылучаны элементы падабенства з творамі Ё. В. Гётэ («Карынфская нявеста», «Танец мерцвякоў»), Г. Бюргера («Ленора»), Э. Т. А. Гофмана («Эліксіры Д’ябла»), Ё. Айхендорфа («Вясельная ноч»). Рэлігійнасць Я. Баршчэўскага і яго сумненне ў магчымасці дасягнення шчасця ў зямным жыцці набліжае яго светапогляд да ідэалагічных пазіцый нямецкіх рамантыкаў «высокага» і позняга перыядаў. Аўтар губляе надзею на дасягненне гармоніі праз яднанне з прыродай ці зямное каханне: прыродная магія, пры ўсёй яе прывабнасці, падаецца як гібельная для героя. Страціўшы веру ў магчымасць зямнога шчасця, Я. Баршчэўскі, як і познія нямецкія рамантыкі, знаходзіць паратунак у веры.

Арыентацыя на беларускі фальклор, дыдактызм (крытыка парушэння рэлігійных запаветаў, імкнення да лёгкага жыцця, п’янства), уласцівыя польскамоўным баладам паэтаў Беларусі першай паловы XIX ст., перайшлі ў першую літаратурную баладу на беларускай мове – «Нячысцік» А. Рыпінскага. Падобныя рысы ў літаратуры на алеманскім дыялекце нямецкай мовы (балада Ё. Хэбэля «Карбункул») дазваляюць сцвярджаць, што выкарыстанне фальклору, павучальнасць, прастата і наіўнасць сюжэта – тыпалагічныя характарыстыкі балады на раннім этапе фарміравання сучасных нацыянальных літаратур.

Параўнальны аналіз паказаў наяўнасць аналогій паміж нямецкімі зборнікамі з рамачнай кампазіцыяй (у першую чаргу «Фантазус» Л. Ціка, «Серапіёнавы браты» Э. Т. А. Гофмана, часткова – «Казкі пра Рэйн» К. Брэнтана) і зборнікам «Шляхціц Завальня, альбо Беларусь у фантастычных апавяданнях» Я. Баршчэўскага. Яны характарызуюцца аўтабіяграфічнасцю (вобраз Янкі, Полаччына і яе насельнікі ў «Шляхціцу Завальні» Я. Баршчэўскага; характар сяброўскіх дыскусій аб мастацтве і літаратуры як адлюстраванне атмасферы літаратурных гурткоў Ены і Берліна, вобразы герояў рамачнага апавядання на старонках «Фантазуса» Л. Ціка і «Серапіёнавых братоў» Э. Т. А. Гофмана), інструменталізмам працэсу

апавядання (У сядзібе пана Завальні госці хаваюцца ад завірухі і маразоў, а казка – іх плата за гасціннасць гаспадара. У «Казках пра Рэйн» героі казкамі «аплачваюць» вызваленне дзяцей з вод Рэйну. У «Фантазусе» і «Серапіёнавых братах» заяўлена мэта апавядання – практычная рэалізацыя ў творах мастацкіх прынцыпаў, якія дэкларуюць аўтары). У даследаваных творах з рамачнай кампазіцыяй прысутнічае адчуванне часовасці далікатнай гармоніі ў суполцы апавядальнікаў і слухачоў, пачуццё пагрозы з боку знешняга асяроддзя. Таксама супадаюць погляды нямецкіх аўтараў і Я. Баршчэўскага на шэраг грамадска-палітычных і філасофскіх пытанняў (захапленне прыродай, падарожжамі, павага да мінулага і старажытнай культурнай спадчыны радзімы), апавядальнікам уласцівы кансерватызм у пытаннях маралі (крытыка модных павеваў у выхаванні дзяцей і г. д.). Адрозненні зборніка Я. Баршчэўскага ад нямецкіх твораў абумоўлены засяроджаннем беларускага аўтара на рэлігійнай, гістарычнай і патрыятычнай праблематыцы. Шырокае выкарыстанне фальклору характэрна для зборнікаў з рамачнай кампазіцыяй Я. Баршчэўскага і К. Брэнтана і ў меншай ступені – для «Фантазуса» Л. Ціка і «Серапіёнавых братоў» Э. Т. А. Гофмана.

У падраздзеле адзначаецца, што аналіз характэрных жанраў рамантычнай літаратуры – балады і зборніка з рамачнай кампазіцыяй – пацвярджае наяўнасць сыходжанняў на светапоглядным, ідэйным, сюжэтным, матыўным узроўнях паміж рамантызмам у шматмоўнай літаратуры Беларусі і творчасцю як прадстаўнікоў нямецкай перадрамантычнай літаратуры, так і нацыянальна арыентаваных рамантыкаў.

У раздзеле 2 **« Спецыфіка мастацкага ўвасаблення хрысціянскага светапогляду ў нямецкай рамантычнай літаратуры і ў шматмоўнай літаратуры Беларусі XIX ст.»** прааналізаваны мадэль хрысціянства ў літаратуры рамантызму, міфалагема Залатога веку, матывы грэхападзення і шляху да Бога праз пакаянне. Паказана, што рэлігійныя канцэпцыі рамантыкаў перажылі істотныя змены на розных этапах развіцця кірунку, аднак у іх аснове заўсёды заставалася ўспрынятая ад ранніх рамантыкаў вера ў непарыўную сувязь паміж індывідам і сусветам, у боскую прыроду чалавека, у магчымасць спасцігнуць таямніцы ўніверсуму шляхам пранікнення ў патаемную сутнасць асобнага чалавека.

У падраздзеле 2.1 **«Мадэль хрысціянства ў літаратуры рамантызму: ад кансерватызму да некананічнай рэлігійнасці»** сцвярджаецца, што выкарыстанне рэлігійных матываў з’яўляецца характэрнай рысай як нямецкага, так і беларускага рамантызму. Містычнае пачуццё прысутнічала ва ўхваленні рамантыкамі прыроды, кахання, мастацтва. Погляды нямецкіх рамантыкаў на рэлігію эвалюцыянавалі ад енскага пантэізму да традыцыйнай

рэлігійнасці К. Брэнтана і Ё. Айхендорфа, аднак цэнтральная ідэя рамантычнай рэлігійнай філасофіі заўсёды была ў тым, што Бог – гэта абсалютнае адзінства, якое праяўляе сябе ў агульнай сувязі ўсяго існага і прычыннасці быцця. Адухаўленне прыроды з'яўляецца адметнасцю творчасці Наваліса, Л. Ціка, К. Брэнтана, Ё. фон Айхендорфа, Я. Баршчэўскага. Традыцыя супрацьпастаўлення язычніцтва і хрысціянства, закладзеная Навалісам у «Гімнах да ночы», была працягнута ў гейдэльбергскі перыяд.

Для большасці айчынных аўтараў XIX ст. традыцыйная хрысціянская вера і рэлігійныя інстытуты выступалі апірышчам ў духоўных пошуках. Я. Чачот у сваіх адносінах да хрысціянства прайшоў шлях ад крытычнасці да юнацкай шчырай рэлігійнасці. Глыбокай верай насычана творчасць Я. Баршчэўскага і В. Дуніна-Марцінкевіча. Уяўленні аб неабходнасці хрысціянскай любові да бліжняга для пабудовы лепшага грамадства выводзяць У. Сыракомлю за рамкі асветніцкіх ці сацыял-дэмакратычных тэорый аб сацыяльных зменах, якія пераважна апелююць да матэрыяльных інтарэсаў. Ф. Багушэвіч нярэдка выказваў пэўны рэлігійны скептыцызм («Бог не роўна дзеле», «Кепска будзе!») і жорстка крытыкаваў афіцыйныя рэлігійныя інстытуты («У судзе», «Свая зямля»), аднак у яго творчасці ў якасці сістэмы маральных каардынатаў экспліцытна ці імпліцытна прысутнічае хрысціянства («Праўда», «Балада» і інш.). Аналіз творчасці паэта сведчыць аб тым, што перапрацаваныя і пераасэнсаваныя рамантыкамі рэлігійныя матывы і сюжэты не страцілі сваёй актуальнасці, калі рамантызм як цэльная плынь ў еўрапейскай літаратуры ў асноўным вычарпаў сябе. У рамантычна афарбаваных творах ураджэнцаў Беларусі вобразы гор як часткі прасторы, набліжанай да неба, птушыных спеваў як голасу нябёсаў, вобразы касцёлаў, цвінтароў і могілак атаясамліваюцца з рэлігійным пачуццём.

Гейдэльбергскія рамантыкі перанеслі цэнтр увагі з індывідуальнага на калектыўнае і абвясцілі народны дух (Volksgeist) рухаючай сілай гісторыі. Ідэі Ф. Шэлінга, Ё. Г. Фіхтэ, Г. В.Ф. Гегеля аб нацыі як арганічным адзінстве і хрысціянскай сутнасці народнага духу мелі значны ўплыў на фарміраванне вобраза простага чалавека як носьбіта хрысціянскага светапогляду. Шчырая вера з'яўляецца адметнай рысай вобразаў беларускіх сялян у творчасці Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, У. Сыракомлі, Ф. Багушэвіча, што збліжае іх з гейдэльбергскімі рамантыкамі. Прадстаўнікі шматмоўнай літаратуры Беларусі XIX ст. падкрэсліваюць роўнасць гаспадароў і падданых з хрысціянскага пункту гледжання. Зварот прадстаўнікоў рамантычнага кірунку айчыннай літаратуры да «мужыцкай» тэмы ў значнай ступені абумоўлены іх хрысціянскім светапоглядам.

У падраздзеле 2.2 « **Міфалагема Залатога веку ў рамантызме: паэтызацыя мінулага і мара аб будучыні»** асэнсавана адна з галоўных міфалагем рамантызму, цесна звязаная з рэлігійнымі ўяўленнямі рамантыкаў. Яна складаецца з трох частак – уяўленні аб шчаслівым мінулым, гісторыі грэхападзення і праекцыі ідэалу ў будучыню. У творах прадстаўнікоў літаратуры Беларусі XIX ст,, якія знаходзіліся пад уплывам ідэй рамантызму, міфалагема Залатога веку стварае «рамантычнае двухсвецце» лірычнага героя: апазіцыя «матэрыяльнае-духоўнае» рэалізуецца ў супрацьпастаўленні недасканалага сучаснага і шчаслівых мінулых часоў. Залатым векам магло быць нявызначанае далёкае мінулае (Я. Чачот, Я. Баршчэўскі), Адраджэнне (гістарычныя драмы У. Сыракомлі «Барбара, вялікая княгіня літоўская і каралева польская», «Магнаты і сірата, або Соф'я, князёўна Слуцкая») ці нават XVIII ст. («Люцынка, альбо Шведы на Літве» В. Дуніна-Марцінкевіча). Уяўленні айчынных пісьменнікаў пра Залаты век, калі край быў вольны, а людзі – маральна дасканалыя, блізкія да вобраза ідэалізаванага Сярэднявечча ў нямецкім рамантызме. Я. Баршчэўскі, У. Сыракомля, В. Дунін-Марцінкевіч бачылі прычыны заняпаду ў краі ў перайманні чужога, у перамозе своекарыслівых інтарэсаў над агульнымі, у дэвальвацыі духоўных каштоўнасцей.

Адным з галоўных вобразаў-сімвалаў Залатога веку ў творчасці А. Міцкевіча, Я. Чачота, Т. Зана, У. Сыракомлі былі малако і мёд, якія паходзяць з антычнай і біблейскай традыцыі[1]. Знакам слаўнага мінулага становіцца старажытны замак, прычым у германскім мастацтве гатычнаму стылю было нададзена сакральнае значэнне нацыянальнага, што не было ўласціва беларускай рамантычнай культуры.

Зварот да ўмоўнага Сярэднявечча з'яўляецца матывіроўкай ужывання фантастычных элементаў (казкі Л. Ціка, Ё. фон Айхендорфа, Ф. де ла Мот Фуке, Э. Т. А. Гофмана і інш., балады Я. Чачота, Я. Баршчэўскага). Сярэднявечча таксама паўстае рэалізацыяй рамантычнай мары аб «сапраўдных хрысціянскіх часах» (Наваліс, К. Брэнтана, Я. Баршчэўскі). Рамантыкі шукаюць у мінулым рашэнні актуальных грамадска-палітычных праблем сучаснасці і шляхі ў напрамку грамадзянскага прагрэсу (нямецкая паэзія часоў напалеонаўскіх войнаў, творчасць Л. Уланда; «Гражына» «Конрад Валенрод», «Пан Тадэвуш» А. Міцкевіча, балады Я. Чачота, «Шляхціц Завальня» Я. Баршчэўскага, «Люцынка, або Шведы на Літве» В. Дуніна-Марцінкевіч, драма «Магнаты і сірата, або Соф'я, князёўна слуцкая» У. Сыракомлі). Гэта набыло асаблівае значэнне ў літаратуры Беларусі XIX ст., паколькі ў сітуацыі жорсткай цэнзуры зварот да гісторыі даваў магчымасць адкрыта выказаць свае патрыятычныя пачуцці.

[1] Багдановіч, І. Э. Авангард і традыцыя: беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння / І. Э. Багдановіч. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 387 с.

У падраздзеле 2.3 **«Матывы грэхападзення і выкуплення грахоў»** даследуецца характар рэалізацыі матываў граху і выкуплення ў творах А. фон Арніма, К. Брэнтана, Э. Т. А. Гофмана, Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, У. Сыракомлі, Ф. Багушэвіча, у якіх канфлікт часта будуецца на рамантычнай апазіцыі духоўнае – матэрыяльнае, увасобленай у супрацьпастаўленні дух – цела ці дух – багацце, улада. А. фон Арнім («Ізабела Егіпецкая, першае юнацкае каханне імператара Карла V»), К. Брэнтана («Рамансы аб Ружанцы»), Э. Т. А. Гофман («Эліксіры Д’ябла») звяртаюцца да матыву першароднага граху як першапрычыны існавання зла ў свеце; пры пошуку шляхоў да пераадолення граху яны робяць акцэнт на ўласных намаганнях чалавека. Айчынныя аўтары разглядаюць свядомае адпадзенне чалавека ад Бога як асноўную прычыну граху, што зблізкае іх пазіцыю з поглядамі Л. Ціка енскага перыяду («Рунэнберг», «Білявы Экберт»). Разам з тым, Я. Баршчэўскі, Я. Чачот, У. Сыракомля, Ф. Багушэвіч упэўнены, што значная частка адказнасці за (не)распаўсюджанне зла ляжыць на пануючых класах. Я. Баршчэўскі лічыць неабходным, каб уласныя намаганні чалавека, накіраваныя на выкупленне грахоў, былі падтрыманыя яго асяроддзем і рэлігійнымі інстытутамі (апавяданні «Ваўкалак», «Радзімы знак на вуснах»). У. Сыракомля, які звяртаецца да тэмы граху і выкуплення ў гавэндах «Паштальён» і «Хадыка», кіруецца прынцыпам свабоды волі і падкрэслівае адказнасць кожнага чалавека за свае дзеянні. Ф. Багушэвіча, у творчасці якога рамантычныя элементы спалучаюцца з натуралізмам і рэалізмам, цікавяць сацыяльныя прычыны маральных заганаў людзей.

У падраздзеле 2.4 **«Матыў падарожжа як шлях да Бога»** паказана, што падарожжа з’яўляецца адным з найбольш характэрных матываў літаратуры рамантычнай плыні. У творчасці ранніх рамантыкаў падарожжа сімвалізуе бесперапынны рух і развіццё жыцця (Наваліс, Л. Цік). У творчасці Ё. фон Айхендорфа і Э. Т. А. Гофмана рэалізуецца значэнне падарожжа як уцёкаў ад змрочнай паўсядзённасці. Філасофскае значэнне падарожжа – метафары жыццёвага шляху, які вядзе да Бога, яскрава прадстаўлены ў паэзіі К. Брэнтана, А. Шаміса, Л. Уланда, Ё. Айхендорфа, В. Мюлера, а таксама творчасці беларускага рамантыка Я. Баршчэўскага. У дысертацыі вызначаны розныя тыпы сюжэтаў пра падарожжа ў зборніку «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» : падарожжа як пошук прызначэння ў жыцці (Янка), падарожжа-выгнанне (Сын Буры, Пакутны Дух, Севярын), падарожжа-служэнне (Алёшка), падарожжа- спакушэнне (лоўчы Сямён).

У раздзеле 3 **«Культ музыкі ў нямецкай рамантычнай літаратуры і ў шматмоўнай літаратуры Беларусі XIX ст.»** асвятляецца роля музыкі ў літаратурна-рамантычным дыскурсе, разглядаецца дзейнасць рамантыкаў па зборы і папулярызацыі народнай песні, яе рэцэпцыя ў рамантычнай

літаратуры, сувязь засваення фальклорнай спадчыны і даследаванняў мовы народа. Вылучаюцца агульныя і адметныя рысы вобраза музыкі ў рамантычнай нямецкай і беларускай літаратуры.

У падраздзеле 3.1 **«Тэма музыкі ў літаратурна-рамантычным дыскурсе»** паказана, як праз зварот да тэмы музыкі праяўляюцца мастацка-эстэтычныя пазіцыі нямецкіх рамантыкаў. Л. Цік, В. Вакенродэр, Э. Т. А. Гофман сакралізавалі музычнае мастацтва як найвышэйшую форму духоўнай дзейнасці чалавека, прычым яны размяжоўвалі ўзвышаную музыку і ўзоры «масавага спажывання». Іх таксама цікавіла ўзаемадзеянне музыкі і паэзіі. Інтэнсіўныя дыскусіі нямецкіх рамантыкаў пра прыроду і ролю музыкі садзейнічалі росквіту еўрапейскай музычнай культуры XIX ст.

У падраздзеле 3.2 **«Песня ў творчасці паэтаў-рамантыкаў»** сцвярджаецца, што характэрнай рысай як нямецкага, так і беларускага рамантызму з'яўляецца зварот да жанру песні ў пошуку новых імпульсаў для развіцця нацыянальных літаратур. Неад'емнай часткай філамацкіх урачыстасцей былі музыка і песні, у тым ліку ўласна складзеныя маладымі паэтамі («Хай радасць з вачэй нашых блісне…» А. Міцкевіча, «Хай звіняць аб чашу чашы …» М. Рукевіча, «Песня філарэтаў» А. Адынца, песні Я. Чачота, у тым ліку беларускамоўная «Ды пакіньце ж горла драць…»). Беларускія і нямецкія рамантыкі чэрпалі натхненне з фальклорных скарбаў і адначасова імкнуліся пабудаваць новае мастацтва з мэтай абуджэння здаровых сіл грамадства. У падраздзеле разглядаецца дзейнасць нямецкіх рамантыкаў па збіранні і апрацоўцы народных песень, гісторыя стварэння паэтычнага зборніка А. фон Арніма і К. Брэнтана «Чароўны рог хлопчыка», а таксама аналізуецца эвалюцыя поглядаў Я. Чачота на значэнне беларускага («крывіцкага») песеннага скарбу ў працэсе падрыхтоўкі фальклорных зборнікаў беларускіх народных песень «з-над Нёмана, Дзвіны, Дняпра і Днястра» (1837–1846). Выяўлена, што погляды Я. Чачота на народную творчасць тыпалагічна блізкія да пазіцыі рамантыкаў гейдэльбергскай суполкі: у збіральніцкай дзейнасці ён развіваў ідэі, сугучныя творчым прынцыпам А. фон Арніма, К. Брэнтана, братоў Грым (імкненне эвалюцыйным шляхам пераадолець раскол паміж адукаванай і неадукаванай часткай грамадства, спалучыць размежаваныя сегменты нацыянальнай культуры ў адзіную моцную плынь).

У падраздзеле 3.3 **«Гераічная і патрыятычная скіраванасць «Спеваў пра даўніх ліцвінаў да 1434 г.» Я. Чачота і нямецкай песні часоў вызваленчых войнаў»** паказваецца, што рамантыкі імкнуліся да таго, каб народная песня не толькі выказвала накіраваную ў мінулае тугу аб страчанай нявіннасці, але і ўздзейнічала на народныя масы, абуджала гістарычную памяць і нацыянальную годнасць. З гэтай мэтай з'ўляліся пераклады і

адаптацыі старых гераічных песень (Л. Цік, Л. Уланд), песні-ўхваленні герояў барацьбы за нацыянальнае вызваленне (А. фон Арнім, Ё. фон Айхендорф, Т. Кёрнер, Э. М. Арндт); рабіліся спробы замяшчэння незахаванага гераічнага эпасу (Я. Чачот). Аналізуюцца эсэ А. фон Арніма «Пра народныя песні» і прадмовы да зборнікаў беларускіх народных песень «з-над Нёмана, Дзвіны, Дняпра і Днястра» Я.Чачота; падкрэсліваецца, што засваенне песеннай спадчыны адыграла вялікую ролю ў абуджэнні цікавасці да мовы народа. Нямецкая мова стала адным з галоўных чыннікаў у працэсе яднання нямецкай нацыі. Захаваная ніжэйшымі пластамі грамадства «крывіцкая» (беларуская) мова стварыла аснову для беларускага нацыянальнага адраджэння.

У падраздзеле 3.4 **«Вобраз муз*ы*кі»** паказана, што паколькі ў рамантычнай літаратуры музыка як форма спасціжэння Бясконцага набывае трансцэндэнтныя характарыстыкі (В. Вакенродэр, Л. Цік), то герой-муз*ы*ка, якому праз пачуццё адчынены шлях да Бясконцага, паўстае творцам, падобным Богу. Рамантыкі горача абараняюць свабоду творцы, яго фантазію, мяркуючы, што геній не падпарадкоўваецца правілам, а стварае іх, трансфармуе рэчаіснасць, будуе свой асаблівы свет, больш рэальны, чым той, што магчыма ўспрыняць эмпірычна. Рамантычныя творы, прысвечаныя муз*ы*кам, насычаныя рэлігійнымі рэмінісцэнцыямі. Пры сутыкненні з жорсткай рэальнасцю раннія рамантыкі прыйшлі да высновы, што энтузіязм і вера ў творчыя здольнасці чалавека не змяншаюць пакуты і несправядлівасць у свеце, і таму аксіялагічная дамінанта ў вобразе рамантычнага муз*ы*кі змясцілася з богароўнасці на трансляцыю Божай волі праз індывідуальную творчасць. В. Вакенродэр, Э. Т. А. Гофман, Ё. Айхендорф вывелі на першы план вобраз мастака-героя, які, нікім не зразумелы, сам-насам супрацьстаіць варожаму наваколлю. У шматмоўнай беларускай паэзіі вобраз муз*ы*кі, натхнёны А Міцкевічам, робіцца адным з цэнтральных. У вершах У. Сыракомлі, Ф. Багушэвіча фігуры муз*ы*кі, песняра ўвасабляюць паэта, творцу. Тэма творчасці і мастака, які знаходзіцца ў канфлікце з рэчаіснасцю, набывае трагедыйнасць; з'яўляецца рамантычны матыў унутранай гераічнасці творцы, уласцівы як нямецкай, так і беларускай рамантычнай літаратуры. У перыяд нацыянальна-вызваленчай барацьбы на першы план выходзіць матыў грамадзянскай місіі мастака, прычым у нямецкім рамантызме галоўнае месца належыць пытанню нацыянальнага яднання (лірыка і балады Л. Уланда), а ў беларускім – пазбаўленню як ад нацыянальнага, так і ад сацыяльнага прыгнёту (паэзія У. Сыракомлі, Ф. Багушэвіча). Рамантычны вобраз песняра, які апявае просты люд, гаворыць з уладарамі ад яго імя, песняй уздымае народ на барацьбу за свае правы, наследуецца беларускай літаратурай канца XIX– пачатку XX ст.

У раздзеле 4 **«Сістэма фантастычнай вобразнасці ў нямецкім рамантызме і ў шматмоўнай літаратуры Беларусі XIX ст.»** сцвярджаецца, што элементы фантастыкі сталі характэрнай прыкметай як нямецкай рамантычнай літаратуры, так і шматмоўнай рамантычнай літаратуры Беларусі, паколькі зварот да яе быў пошукам шляхоў для пераадолення абмежаванняў рацыянальнага светаўспрымання і больш глыбокага, чым дазваляе рэальнасць, спасціжэння жыцця. Праведзены параўнальна-супастаўляльны аналіз сімволікі прасторавых аб'ектаў (гор, лесу, рэк, азёр), вобразаў іх насельнікаў, а таксама вобразаў чараўнікоў у нямецкай рамантычнай літаратуры і ў шматмоўнай літаратуры Беларусі XIX ст.

Падраздзел 4.1 **«Фантастычныя вобразы ў сімвалічнай мове рамантызму: крыніцы і функцыі»** паказвае спробы рамантыкаў (К. Брэнтана, Л.Цік, Ф. де ла Мот Фуке, А. фон Шаміса, Э. Т. А. Гофман) стварыць новую міфалогію, здольную мовай вобразаў даносіць да людзей складаныя ідэі. Беларускі рамантык Я. Баршчэўскі імкнуўся з дапамогай міфалагізацыі выказаць ідэі нацыянальнага маштабу. Выяўлена, што ў цэлым рамантычная вобразная сістэма не склалася ва ўніверсальную міфалагічную мову накшталт старажытнагрэчаскай, а захавала індывідуальны аўтарскі характар. У перыяд рамантызму антычная грэчаская міфалогія страціла свой нарматворчы характар, абудзілася цікавасць да фальклорнай спадчыны іншых еўрапейскіх народаў. Сярод нямецкіх рамантыкаў вялася дыскусія аб прынцыпах увядзення фальклорных элементаў у літаратурны кантэкст, і большасць з іх (Наваліс, Л. Цік, А. фон Арнім, К. Брэнтана і інш.) адаптавалі фальклор згодна са сваімі мастацкімі мэтамі. На іншай пазіцыі знаходзіліся браты Грым, якія настойвалі на захаванні максімальнай аўтэнтычнасці элементаў фальклору ў літаратуры (зборнік «Нямецкія сагі» «*Deutsche Sagen*», 1816). Згодна з прынцыпам захавання аўтэнтычнасці беларускай народнай спадчыны створаны раннія балады Я. Чачота. А. Міцкевіч распачаў традыцыю творчай перапрацоўкі фальклорнага матэрыялу, якую працягвала большасць айчынных аўтараў. Я. Баршчэўскі пры спалучэнні фальклору і аўтарскай фантазіі ў сваіх творах імкнуўся захаваць этнаграфічную дасканаласць міфапаэтычнай сімволікі.

У падраздзеле 4.2 **«Сімволіка гор, лесу і вобразы іх насельнікаў»** даследуецца сімвалічнае значэнне прасторавых аб'ектаў (гор, лясоў) у рамантычных творах, а таксама сістэма фантастычных вобразаў, непасрэдна звязаных са згаданымі элементамі ландшафту. Паказана, што вобраз гор у нямецкім рамантызме мае амбівалентны характар. Скіраванасць гор да неба актуалізуе яго пазітыўную напоўненасць, а цёмная падземныя горныя нетры атаясамліваюцца з цёмным д'ябальскім пачаткам. Спасціжэнне горных таямніц можа зрабіць чалавека шчаслівым і свабодным (Наваліс, Л. Уланд),

аднак яны хаваюць смяротную пагрозу (Л. Цік, Э. Т. А. Гофман). У творчасці айчынных аўтараў горы – месца кантакту чалавека з іншасветам (А. Міцкевіч, Я. Чачот, Я. Баршчэўскі). Вобразы гор на чужыне надаюць апісанню прасторы ўласцівы рамантызму элемент экзатычнасці (Альпы, горы Крыма ў паэзіі А. Міцкевіча). Горы, якія знаходзяцца на радзіме, маюць пераважна станоўчае сімвалічнае значэнне; яны яднаюць сучаснае і мінулае (Я. Чачот, Я. Баршчэўскі). У рамантычнай нямецкай літаратуры і ў шматмоўнай літаратуры Беларусі з элементамі рамантычнай эстэтыкі грунтоўна распрацавана тэма лесу як агульнага скарбу, лесу як прасторы, дзе магчымы кантакт з іншасветам; у абедзвюх літаратурах прысутнічае вобраз паляўнічага як вандроўніка паміж рэальным і звышрэальным сусветам. Нямецкі рамантычны матыў «лясной адзіноты» («*Waldeinsamkeit*») нетыповы для рамантычнай літаратуры Беларусі, таму што ён не адпавядае традыцыйным уяўленням беларускага народа аб немагчымасці шчасця ў ізаляцыі ад іншых людзей, ад грамады. Калі ў нямецкай традыцыі лес выступае як калыска і сімвал нацыі, то ў беларускай акцэнт робіцца на лесе як «месцы сілы», сховішчы і крыніцы рэсурсаў.

У падраздзеле 4.3 **«Сімволіка вады і вобразы фантастычных водных істот»** даследуецца тэма воднай стыхіі як крыніцы сімволікі для ўвасаблення рамантычных ідэй. Сцвярджаецца, што за топасам ракі (возера) нярэдка замацоўваецца набор характэрных рамантычных фабул, што вядзе да ўзнікнення літаратурных міфалагем рэк і азёр (міфалагема рамантычнага Рэйну, міфалагема Свіцязі). Аналізуюцца агульныя і адметныя элементы сюжэтаў пра паглынанне гораду ці хаты вадою ў нямецкай і айчыннай літаратуры (творы Ф. Шлегеля, Л. Уланда, А. Міцкевіча, Я. Чачота, Т. Зана, Я. Баршчэўскага). У літаратуры Беларусі гэты сюжэт звязаны з матывам граху і пакарання, што не характэрна для нямецкай літаратуры; дыдактызм сведчыць аб значным уплыве на айчынную рамантычную літаратуру фальклорнай традыцыі і народнай маралі. Фальклорная традыцыя праяўляецца ў персаніфікацыі рэк – часцей у беларускай літаратуры (А. Вярыга-Дарэўскі, Адэля з Устроні, І. Храпавіцкі), радзей у нямецкай (К. Брэнтана). Галоўным фантастычным вобразам, непасрэдна звязаным са стыхіяй вады, стаў вобраз «воднай чараўніцы» (русалкі, ундзіны, сірэны, феі). У ім знайшлі сваё ўвасабленне фальклорныя матывы, звязаныя з алхіміяй сярэднявечныя ўяўленні пра стыхіі, элементы антычнай міфалогіі, якія падвяргаліся аўтарскай інтэрпрэтацыі ў адпаведнасці з паэтычнай сістэмай рамантычнага кірунку. Русалка ўвасабляе покліч недасяжнай і няўлоўнай прыгажосці, імкненне да якой можа каштаваць жыцця. Жаночыя вобразы з балады «Лорэ Лея» К. Брэнтана і казкі «Ундзіна» Ф. дэ Ла Мот Фуке натхнілі іншых нямецкіх мастакоў слова на стварэнне празаічных і

вершаваных твораў пра водных чараўніц (Ё. Айхендорф, Э. Мёрыке, Г. Гейнэ). Распаўсюджанасць вобраза русалкі ў айчыннай літаратуры рамантычнага характару (балады Я. Чачота, А. Міцкевіча, Я. Баршчэўскага, А. Грот-Спасоўскага) абумоўлена не толькі ўплывам еўрапейскай літаратуры, але і ўкараненнем вобраза ў беларускі фальклор.

Агульнымі для твораў, прысвечаных русалкам, з’яўляюцца матыў няроўнасці (ён і яна належаць да розных сацыяльных груп ці яна паходзіць з іншасвету), матыў віны героя (карысталюбства, пыхлівасць, пажаднасць, парушэнне забароны), матыў пакарання. Калі кантакт з русалкай вядзе героя да пагібелі, то гэта часцей за ўсё яго віна, вынік яго памылак. Папулярнасць сюжэтаў пра русалак вядзе да іх ператварэння ў літаратурныя штампы, таму на познім этапе развіцця рамантызму гэтыя персанажы робяцца аб’ектам іроніі і пародыі (Г. Гейнэ, Ё. Айхендорф). Гісторыю пра азярыну ля вёскі Галубова («Рыбак Родзька» Я. Баршчэўскага) таксама можна разглядаць як пародыю на балады пра Рэйнскую русалку («анты-Ларэлею»): на захадзе сонца пасярэдзіне ляснога возера (класічнае «ларэлейнае» месца і час) спявае фантастычная істота. Аднак гэта не прыгажуня-спакусніца з залатымі валасамі, а агідны чорны шатан, чые песні не чаруюць слухачоў, а прымушаюць іх уцякаць. Прыклад дэманструе, што для айчынных твораў, прысвечаных містычным насельнікам рэк і азёр, характэрна спалучэнне еўрапейскай літаратурнай традыцыі з беларускім фальклорным матэрыялам у аўтарскай інтэрпрэтацыі.

У падраздзеле 4.4 **«Вобразы чараўнікоў»** паказана, што ў рамантычнай литаратуры чараўнікі выконваюць ролю павадыра ў свет фантастычнага і ірацыянальнага. Магічнае паўстае як частка прыроды, патаемных сіл, якімі прасякнутае ўсё існае. Рамантыкі палемізуюць з філасофіяй Асветніцтва, ставяць пад сумненне неабмежаваныя магчымасці розуму ў пазнанні прыроды. Пры звароце рамантыкаў да традыцыйнага хрысціянства чароўнае супрацьпастаўляецца цуду ў рэлігійным сэнсе і нярэдка набывае негатыўнае значэнне. Параўнанне вобразаў чараўнікоў у творчасці нямецкіх рамантыкаў А. фон Арніма (Карнэлі Няпот), Э. Т. А. Гофмана (героі казак «Курдупель Цахес, якога звалі Цынобэр», «Залаты гаршчок») і Я. Баршчэўскага дазваляе вылучыць шэраг агульных рыс: арыентацыя на традыцыйнае хрысціянства (А. фон Арнім, Я. Баршчэўскі), супрацьпастаўленне прыродна-матэрыяльнага і духоўна-рэлігійнага (А. фон Арнім, Э. Т. А. Гофман, Я. Баршчэўскі). У гісторыі цудоўнага лекара Саматніцкага («Душа не ў сваім целе») Я. Баршчэўскі перасцерагае тых, хто імкнецца спасцігнуць розумам тайны сусвету. Элементы падабенства ў вобразах чараўнікоў, крытыка магнетызму і сумненне ў магчымасці чалавека падпарадкаваць прыроду сведчыць пра пэўныя тыпалагічныя сыходжанні ў творчасці Э. Т. А. Гофмана і Я. Баршчэўскага.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Прычынамі сыходжанняў паміж нямецкім нацыянальна арыентаваным рамантызмам і рамантызмам у гетэрагеннай культуры шматмоўнай літаратуры Беларусі XIX ст. з'яўляецца ўсведамленне немагчымасці вырашыць наяўныя сацыяльна-палітычныя праблемы рэвалюцыйна, а таксама засваенне і пераасэнсаванне як нямецкімі нацыянальна арыентаванымі рамантыкамі, так і айчыннымі аўтарамі інтэлектуальных здабыткаў нямецкага перадрамантызму. Аналіз творчай спадчыны і карэспандэнцыі філаматаў дазволіў вылучыць кантактныя сувязі з нямецкай літаратурай. Паказана, што філаматы былі знаёмыя з творамі Ё. В. Гётэ, Ё. Гердэра, Ф. Шылера, Г. Бюргера, Ё. Гляйма і іншых прадстаўнікоў нямецкага перадрамантызму, а таксама з ідэямі вядучага тэарэтыка рамантызму А.В. Шлегеля [1–А, 2–А, 20–А].

2. На жанравым узроўні ўплывы і сыходжанні паміж нямецкім і айчынным рамантычнымі кірункамі ярка праяўляюцца ў жанры балады, а таксама ў зборніках з рамачнай кампазіцыяй. Фарміраванне жанру літаратурнай балады ў беларускім рамантызме суправаджалася рэцэпцыяй баладнай творчасці нямецкіх «штурмераў» (Ё. В. Гётэ, Ф. Шылера, Г. Бюргера, Ё. Гляйма). Нямецкая перадрамантычная балада нярэдка звяртаецца да сацыяльнай і маральна-этычнай праблематыкі, што менш уласціва рамантычнай баладзе, якая характарызуецца засваеннем народнай вуснапаэтычнай традыцыі. Беларуская балада спалучае маральны дыдактызм з формамі і вобразамі, народжанымі фальклорнай традыцыяй (Я. Чачот, Я. Баршчэўскі, А. Рыпінскі). Супастаўленне беларускай і нямецкай балады перадрамантычнага і рамантычнага перыядаў паказала, што беларуская балада XIX ст. падпарадкоўвалася агульным законам развіцця жанру. Гэта справядліва і ў адносінах да зборніка Я. Баршчэўскага «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях», які адрозніваецца ад нямецкіх твораў з рамачнай кампазіцыяй засяроджаннем на рэлігійнай, гістарычнай і патрыятычнай праблематыцы [1–А, 6–А, 8–А, 12–А, 15–А, 17–А, 18–А, 26–А].

3. Блізкасць філасофскіх і мастацка-эстэтычных канцэпцый нямецкага і беларускага рамантызму праяўляецца ў адухаўленні прыроды (Ф. Шлеермахер Ф. Шэлінг, Л. Цік, Навалiс, К. Брэнтана, Ё. фон Айхендорф, Я. Баршчэўскі), уяўленнях аб нацыі як арганічным адзінстве і хрысціянскай сутнасці народнага духу (гейдэльбергскія рамантыкі, Я. Чачот, Я. Баршчэўскі, У. Сыракомля, Ф. Багушэвіч), звароце да міфалагемы Залатога веку (Навалiс, Л. Цік, гейдэльбергскія рамантыкі, Ф. дэ ла Мот Фуке, Л. Уланд, Я. Чачот, Я. Баршчэўскі, У. Сыракомля, В. Дунін-Марцінкевіч). Калі для Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча важна захаванне традыцыйных рэлігійных практык, то Ф. Багушэвічу ўласцівая суб'ектыўна-чалавечая, некананічная рэлігійнасць. Адным з вядучых матываў як нямецкага, так і

шматмоўнага беларускага рамантызму з'яўляецца матыў граху і выкуплення. А. фон Арнім, К. Брэнтана, Э. Т. А. Гофман разглядаюць першародны грэх як першапрычыну існавання зла ў свеце, іх цікавяць уласныя намаганні чалавека на шляху да пераадолення граху. Айчынныя рамантыкі бачаць асноўную прычыну граху ў свядомым адпадзенні чалавека ад Бога, што зблiжае іх пазіцыю з поглядамі Л. Ціка енскага перыяду. Адметнасцю беларускага рамантызму з'яўляецца ўскладанне значнай часткі адказнасці за (не)распаўсюджанне зла на заможных і адукаваных прадстаўнікоў грамадства. У рамантычным матыве падарожжа метафарычна асэнсаваны жыццёвы шлях чалавека як вяртанне да Бога (Я. Баршчэўскі, гейдэльбергскія рамантыкі) [5–А, 9–А, 10–А, 13–А, 14–А, 21–А, 22–А, 23–А].

4. Рамантыкі разглядалі музычнае мастацтва як найвышэйшую форму духоўнай дзейнасці чалавека, з гэтай прычыны тэма м*у*зыкі і муз*ы*кі стала адной з галоўных у літаратуры кірунку (В. Вакенродэр, Л. Цік, Э.Т.А. Гофман, Ё. Айхендорф, У. Сыракомля, Ф. Багушэвіч). Мастацка-эстэтычныя пазіцыі рамантыкаў праявіліся і ўвасобіліся ў дзейнасці, накіраванай на развіццё жанру песні. Збіранне і вывучанне рамантыкамі народнай песні ўзбагаціла нацыянальную літаратуру і паказала значэнне нацыянальнай мовы як аднаго з галоўных чыннікаў нямецкага нацыянальнага яднання і фарміравання беларускай нацыі (А. фон Арнім, К. Брэнтана, Я. Чачот). Песні гераічнай і патрыятычнай тэматыкі, створаныя паэтамі-рамантыкамі, абуджалі гістарычную памяць і нацыянальную годнасць. У нямецкай літаратуры адпаведнага кірунку дамінуе вобраз героя-муз*ы*кі, які знаходзіцца ў канфлікце з рэчаіснасцю (В. Вакенродэр, Э.Т.А. Гофман, Ё. Айхендорф). Нацыянальна-вызваленчая барацьба выводзіць на першы план матыў грамадзянскай місіі песняра (Л. Уланд). У беларускай шматмоўнай літаратуры XIX ст. вобразы муз*ы*кі, песняра, які ўвасабляе надзеі і спадзяванні народа, набываюць абагульненае значэнне творцы (У. Сыракомля, Ф. Багушэвіч) [3–А, 4–А, 12–А, 13–А].

5. Выкарыстанне элементаў фантастыкі стала характэрнай прыкметай рамантычнай літаратуры. Фантастыка раскрывала жыццё больш глыбока, чым дазваляў рацыяналізм. Важнай крыніцай фантастычных вобразаў як у нямецкай, так і ў беларускай літаратуры з'яўляецца фальклорная спадчына. Рамантызм сфарміраваў сістэму фантастычных вобразаў, непасрэдна звязаных з элементамі ландшафту. Вобраз гор у нямецкім рамантызме мае амбівалентны характар (Л. Цік, Э.Т.А. Гофман), а ў літаратуры Беларусі ён пераважна станоўчы (Я. Чачот, Я. Баршчэўскі). Русалка ўвасабляе таямнічыя сілы прыроды, покліч недасяжнай і няўлоўнай прыгажосці, імкненне да якой можа каштаваць жыцця. Дэманічныя рысы ў вобразе русалкі адлюстроўваюць ілюзорнасць пошуку абсалютнага ідэалу ў зямным каханні і страту веры ў магчымасць гармоніі чалавека і прыроды (К. Брэнатана, Ё. Айхендорф, Э. Мёрыке,

Ф. дэ ла Мот Фуке). У творах, прысвечаных «водным жанчынам» (русалкам, ундзінам, феям, лясным чараўніцам), з'яўляюцца матыў няроўнасці (ён і яна належаць да розных сацыяльных груп ці яна паходзіць з іншасвету), матыў віны героя (карыслівасць, пыха, юрлівасць, парушэнне забароны), матыў пакарання. Адметнасцю аўтарскай інтэрпрэтацыі вобразаў чароўных водных насельнікаў у творах Я. Чачота, А. Міцкевіча, Я. Баршчэўскага, А. Грот-Спасоўскага з'яўляецца актыўнае перайманне элементаў беларускіх казак і паданняў пра вадзянікоў і русалак. У рамантычных творах чараўнікі выконваюць ролю павадыра ў свет фантастычнага і ірацыянальнага. Пры ўзмацненні арыентацыі рамантыкаў на традыцыйнае хрысціянства чароўныя з'явы супрацьпастаўляюцца цуду ў хрысціянскім разуменні і набываюць негатыўны сэнс. Вобразы чараўнікоў у творах Э.Т.А. Гофмана і Я. Баршчэўскага яднае крытычнае стаўленне да магнетызму і сумненне ў здольнасці чалавека падпарадкаваць прыроду [7–А, 11–А, 16–А, 19–А, 24–А, 25–А].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Вынікі дысертацыйнага даследавання з'яўляюцца актуальнымі для вывучэння беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнай. Матэрыялы навуковай працы могуць быць выкарыстаны пры далейшым даследаванні рамантызму ў літаратуры Беларусі, вывучэнні гісторыі беларускай і нямецкай літаратур, у падрыхтоўцы падручнікаў, курсаў лекцый і семінараў для вучняў сярэдніх школ і студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей устаноў вышэйшай адукацыі, напісанні курсавых і дыпломных работ па беларускай і замежнай (нямецкай) літаратурах.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ

**Артыкулы ў навуковых выданнях, рэкамендаваных ВАК**

1–А. Батурына, А. Л. Ад Ляноры да Эмілі – гісторыя аднаго літаратурнага пераўвасаблення / А. Л. Батурына // Роднае слова. – 2018. – № 10. – С. 20–23.

2–А. Батурына, А.Л. Роля нямецкіх тэарэтыка-эстэтычных канцэпцый канца XVIII – пачатку XIX стагоддзяў у станаўленні рамантычнай плыні літаратуры Беларусі / А. Л. Батурына // Изв. Гомел. гос. ун-та им. Ф. Скорины. – 2019. – № 4. – С. 62–65.

3–А. Батурына, А. Л. Тэма музыкі ў літаратуры рамантызму (на матэрыяле паэтычных і публіцыстычных твораў Я. Чачота і гейдэльбергскіх рамантыкаў) / А. Л. Батурына // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. 3, Філалогія. Педагогіка. Псіхалогія. – 2019. – № 2. – С. 44–49.

4–А. Батурына, А. Л. Эвалюцыя вобраза музыкі як рамантычнага героя (на матэрыяле творчасці нямецкіх рамантыкаў і прадстаўнікоў рамантычнай плыні ў літаратуры Беларусі XIX ст.) / А. Л. Батурына // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ. ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск : Права і эканоміка, 2020. – Вып. 28. – С. 250–256.

5–А. Батурына, А. Л. Зварот да хрысціянскіх матываў як адметная рыса рамантызму: на матэрыяле твораў нямецкіх рамантыкаў і Францішка Багушэвіча / А. Л. Батурына // Роднае слова. – 2020. – № 12. – С. 17–20.

6–А. Батурына, А. Л. Творчасць Я. Чачота і традыцыі класічнай нямецкай літаратуры канца XVIII – пачатку XIX ст. / А. Л. Батурына // Изв. Гомел. гос. ун-та им. Ф. Скорины. – 2023. – № 4. – С. 47–53.

7–А. Батурына, А. Л. Сірэна, русалка, ундзіна: фантастычныя жаночыя вобразы ў літаратуры рамантызму (на матэрыяле твораў нямецкіх і беларускіх рамантыкаў) / А. Л. Батурына // Роднае слова. – 2023. – № 8. – С. 41–44.

**Артыкулы ў навуковых зборніках і часопісах**

8–А. Батурына, А. Л. Асаблівасці ранняга этапу развіцця нямецкай і беларускай літаратурнай балады / А. Л. Батурына // Актуальные проблемы филологии : сб. науч. ст. / М-во образования Респ. Беларусь, Гомел. гос. ун-т им. Ф. Скорины : редкол.: А. В. Бредихина (гл. ред.) [и др.]. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2018. – Вып. 11. – С. 62–69.

9–А. Батурына, А. Л. Адлюстраванне хрысціянскага светапогляду ў нямецкай і беларускай рамантычнай літаратуры / А. Л. Батурына // Вопросы лингвистики и методики преподавания иностранного языка : сб. науч. ст. / М-во образования Респ. Беларусь, Гомел. гос. ун-т им. Ф. Скорины : редкол.:

Е. В. Сажина (гл. ред.) [и др.]. – Гомель : ГГУ им. Ф.Скорины, 2019. – Вып. 8. – С. 3–7.

10–А. Батурина, Е. Л. Религиозные мотивы в творчестве немецких романтиков / Е. Л. Батурина // Язык и межкультурная коммуникация: современные векторы развития : сб. науч. ст. по материалам I Междунар. науч.-практ. конф., Пинск, 12 апр. 2019 г. / Полес. гос. ун-т ; редкол.: К. К. Шебеко [и др.]. – Пинск : ПолесГУ, 2019. – С. 277–283.

11–А. Батурына, А. Л. Вобразы чараўнікоў у нямецкай і беларускай рамантычнай літаратуры / А. Л. Батурына // Актуальные проблемы филологии : сб. науч. ст. / М-во образования Респ. Беларусь, Гомел. гос. ун-т им. Ф. Скорины ; редкол. : Е. Л. Хазанова (гл. ред.) [и др.]. – Гомель: ГГУ им. Ф. Скорины, 2020. – Вып. 13. – С. 15–20.

12–А. Батурына, А. Л. Творчасць Яна Чачота ў парадыгме рамантызму // Рэгіянальнае, нацыянальнае, агульначалавечае ў славянскіх літаратурах : зб. навук. арт. па выніках VI Міжнар. навук. чытанняў, прысвеч. памяці нар. пісьменніка Беларусі, акад. І. Я. Навуменкі, Гомель, 2–3 кастр. 2018 г. / П. І. Навуменка [і інш.] ; уклад. І. Ф. Штэйнер. – Мінск : Unipack, 2020. – С. 234–240.

13–А. Батурына, А. Л. Зварот да нацыянальнай гісторыі ў рамантычнай паэзіі (на матэрыяле твораў нямецкіх рамантыкаў і прадстаўнікоў рамантычнай плыні ў літаратуры Беларусі XIX ст.) / Вопросы лингвистики и методики преподавания иностранного языка : сб. науч. ст. / М-во образования Респ. Беларусь, Гомел. гос. ун-т им. Ф. Скорины ; редкол. : Е. В. Сажина (гл. ред.) [и др.]. – Гомель: ГГУ им. Ф. Скорины, 2020. – Вып. 9. – С. 49–54.

14–А. Батурына, А. Л. Асэнсаванне прыроды граху ў рамантызме (на матэрыяле твораў А. фон Арніма, Э. Т. А. Гофмана і Я. Баршчэўскага) // Спадчына І. Я. Навуменкі і актуальныя праблемы літаратуразнаўства : зб. навук. арт. / М-во образования Респ. Беларусь, Гомел. гос. ун-т им. Ф. Скорины ; рэдкал.: І. Ф. Штэйнер [і інш.]. – Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны, 2022. – Вып. 4. – С. 46–53.

15–А. Батурина, Е. Л. Использование обрамляющей композиции в немецкой литературе конца XVIII – начала XIX веков (на материале произведений Й. В. фон Гете, Л. Тика, Э. Т. А. Гофмана, К. Брентано) / Е. Л. Батурина // Язык и межкультурная коммуникация: современные векторы развития : сб. науч. ст. по материалам II Междунар. науч.-практ. конф., Пинск, 26 марта 2021 г. / Полес. гос. ун-т. ; редкол.: К. К. Шебеко [и др.]. – Пинск : ПолесГУ, 2021. – С. 379–385.

16–А. Батурына, А. Л. Крыніцы фантастычнай вобразнасці ў нямецкай і беларускай шматмоўнай рамантычнай літаратуры XIX ст. // Спадчына

І. Я. Навуменкі і актуальныя праблемы літаратуразнаўства : зб. навук. арт. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны ; рэдкал. : І. Ф. Штэйнер [і інш.]. – Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны, 2022. – Вып. 5. – С. 8–13.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

17–А. Батурына, А. Л. Пераемнасць традыцыі ў развіцці нямецкай і беларускай літаратурнай балады / А. Л. Батурына // Актуальные проблемы романо-германской филологии и методики преподавания иностранных языков : материалы VIII Междунар. науч.-практ. конф., Гомель, 26 окт. 2018 г. / М-во образования Респ. Беларусь, Гомел. гос. ун-т имени Ф. Скорины ; редкол. Л. И. Богатикова (гл. ред.) [и др.]. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2018.– С. 249–254.

18–А. Батурына, А. Л. Станаўленне беларускай балады і традыцыі нямецкай класічнай паэзіі / А. Л. Батурына // Рэгіянальнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў літаратуры : матэрыялы VI Міжнар. навук. чытанняў, прысвеч. памяці нар. пісьменніка Беларусі, акад. І. Я Навуменкі, Гомель, 2–3 кастр. 2018 г.. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны ; рэдкал. І. Ф. Штэйнер (гал рэд.) [і інш.]. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2018. – С. 134–139.

19–А. Батурына, А. Л. Жаночыя вобразы нямецкага рамантызму (на матэрыяле казачных навэл Л. Ціка) // Актуальные проблемы романо-германской филологии и методики преподавания иностранных языков : материалы IX Междунар. науч.-практ. конф., Гомель, 25 окт. 2019 г / М-во образования Респ. Беларусь, Гомел. гос. ун-т им. Ф. Скорины ; редкол.: Е. В. Сажина (гл. ред.) [и др.]. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2019. – С. 175–181.

20–А. Батурына, А. Л. Рэцэпцыя нямецкай літаратуры і станаўленне рамантычнай плыні ў польскамоўнай літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя / А. Л. Батурына // Скарынавы запаветы і сучаснасць : да 95-годдзя з дня нараджэння праф. У. В. Анічэнкі : матэрыялы міжнар. навук. канф., Гомель, 22 лістап. 2019 г. / Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны ; рэдкал. : А. М. Воінава (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны. – С. 20–26.

21–А. Батурына, А. Л. Матыў падарожжа ў нямецкім рамантызме і творчасці беларуска-польскага рамантыка Я. Баршчэўскага / А. Л. Батурына // Рэгіянальнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў літаратуры : матэрыялы VI Міжнар. навук. чытанняў, прысвеч. памяці нар. пісьменніка Беларусі, акад. І. Я Навуменкі, Гомель, 8-9 кастр. 2020 г. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны ; рэдкал. І. Ф. Штэйнер (гал рэд.) [і інш.]. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2020. – С. 11–15.

22–А. Батурына, А. Л. Эвалюцыя рэлігійных канцэпцый нямецкіх рамантыкаў / А. Л. Батурына // Актуальные проблемы романо-германской филологии и методики преподавания иностранных языков : материалы X Междунар. науч.-практ. конф., Гомель, 23 окт. 2020 г / М-во образования Респ. Беларусь, Гомел. гос. ун-т им. Ф. Скорины ; редкол.: Е. В. Сажина (гл. ред.) [и др. ]. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2020. – С. 124–130.

23–А. Батурына, А. Л. Вобраз Сярэднявечча ў нямецкай і беларускай польскамоўнай рамантычнай літаратуры XIX ст. / А. Л. Батурына // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай : матэрыялы XIII Міжнар. навук. канф., прысвеч. 100-годдзю БДУ і 90-годдзю з дня нараджэння чл.-кар. Нац. акад. навук Беларусі праф. А. А. Лойкі, Мінск, 28–29 кастр. 2021 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: С. А. Важнік (гал. рэд.) [і інш.] ; навук. рэд. А. І. Бельскі. – Мінск : БДУ, 2021. – С. 229–233.

24–А. Батурына, А. Л. Лес як частка нацыянальнай культурнай ідэнтычнасці ў нямецкай і шматмоўнай беларускай рамантычнай літаратуры [Электроны рэсурс] / А. Л. Батурына // Нацыянальны характар і спосабы яго ўвасаблення ў культуры і мове ва ўмовах мульцікультурнага асяроддзя : электрон. зб. матэрыялаў II Міжнар. навук. канф., Полацк, 24–25 сак. 2022 г. / Полац. дзярж. ун-т імя Еўфрасінні Полацкай ; рэдкал.: Н. В. Несцер, С. М. Лясовіч, К. А. Шарова. – Наваполацк, 2022. – 1 электрон. апт. дыск (CD-R). – С. 56–63. (https://disk.yandex.ru/d/_WVK7EfX3ivhgw)

25–А. Батурына, А. Л. Сімволіка гор у літаратуры рамантызму (на матэрыяле твораў Я. Чачота, Я. Баршчэўскага і нямецкіх рамантыкаў) // Рэгіянальнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў літаратуры : матэрыялы VIII Міжнар. навук. чытанняў, прысвеч. памяці нар. пісьменніка Беларусі, акад. І. Я Навуменкі, Гомель, 4–5 кастр. 2022 г. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны ; рэдкал.: І. Ф. Штэйнер (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2022. – С. 13–17.

26–А. Батурына, А. Л. Вобраз апавядальніка ў зборніках з рамачнай кампазіцыяй (на матэрыяле твораў Л. Ціка, Э. Т. А. Гофмана і Я. Баршчэўскага) [Электронный ресурс] / А. Л. Батурына // Гугнинские чтения : электрон. сб. ст. I Междунар. научн. конф., Полоцк, 5–6 мая 2022 г. / Полоц. гос. ун-т им. Евфросинии Полоцкой ; отв. за вып. Е. В. Лушневская. – Новополоцк, 2023. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM). – С. 108–117.

## РЭЗЮМЭ

**Батурына Алена Львоўна**

## СТАНАЎЛЕННЕ РАМАНТЫЧНЫХ ПРЫНЦЫПАЎ У БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XIX СТАГОДДЗЯ І ТРАДЫЦЫІ НЯМЕЦКАГА РАМАНТЫЗМУ

**Ключавыя словы:** рамантызм, беларуская літаратура, нямецкая літаратура, балада, рамачная кампазіцыя, хрысціянства, патрыятызм, Залаты век, музыка, народная песня, фантастыка.

**Мэта даследавання** – вызначыць асаблівасці станаўлення рамантычных прынцыпаў адлюстравання рэчаіснасці ў беларускай літаратуры XIX ст. і ролю традыцый класічнай нямецкай літаратуры ў гэтым працэсе.

**Метады даследавання**: параўнальна-гістарычны, культурна-гістарычны, апісальны, асобныя элементы біяграфічнага і сацыялагічнага метадаў.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** У дадзеным даследаванні ўпершыню ў айчынным літаратуразнаўстве даследавана роля найбольш значных узораў нямецкай тэарэтыка-эстэтычнай і мастацкай літаратуры XVIII–XIX ст. у фарміраванні рамантычнага кірунку ў літаратуры Беларусі XIX ст. Паказана роля нямецкай класічнай літаратуры ў фарміраванні рамантычнай балады і зборніка апавяданняў з рамачнай кампазіцыяй у літаратуры Беларусі; вылучаны агульныя і адметныя рысы ва ўвасабленні беларускімі і нямецкімі аўтарамі характэрных рамантычных вобразаў, вызначаны мастацкія дамінанты літаратуры Беларусі XIX стагоддзя з элементамі рамантычнай эстэтыкі.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні атрыманых вынікаў.** Вынікі дысертацыйнага даследавання з'яўляюцца актуальнымі для вывучэння беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнай. Матэрыялы навуковай працы могуць быць выкарыстаны пры далейшым даследаванні рамантызму ў літаратуры Беларусі, вывучэнні гісторыі беларускай і нямецкай літаратур, у падрыхтоўцы падручнікаў, курсаў лекцый і семінараў для вучняў сярэдніх школ і студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей устаноў вышэйшай адукацыі, напісанні курсавых і дыпломных работ па беларускай і замежнай (нямецкай) літаратурах.

**Сфера прымянення.** Літаратуразнаўства (гісторыя літаратуры, тэорыя літаратуры).

## РЕЗЮМЕ

**Батурина Елена Львовна**

## СТАНОВЛЕНИЕ РОМАНТИЧЕСКИХ ПРИНЦИПОВ В БЕЛОРУССКОЙ ЛИТЕРАТУРЕ XIX ВЕКА И ТРАДИЦИИ НЕМЕЦКОГО РОМАНТИЗМА

**Ключевые слова:** романтизм, белорусская литература, немецкая литература, баллада, рамочная композиция, христианство, патриотизм, Золотой век, музыка, народная песня, фантастика.

**Цель исследования** – определить особенности становления романтических принципов отражения действительности в белорусской литературе XIX века и роль традиций классической немецкой литературы в этом процессе.

**Методы исследования.** Сравнительно-исторический, культурно-исторический, описательный, отдельные элементы биографического и социологического методов.

**Полученные результаты и их новизна.** В данном исследовании впервые в отечественном литературоведении исследована роль наиболее значительных образцов немецкой теоретико-эстетической и художественной литературы XVIII–XIX вв. в становлении романтизма в литературе Беларуси XIX в. Показана роль немецкой классической литературы в формировании романтической баллады и сборников рассказов с рамочной композицией в литературе Беларуси; проанализированы общие и отличительные черты в воплощении типичных романтических образов белорусских и немецких авторов, определены художественные доминанты литературы Беларуси XIX века с элементами романтической эстетики.

**Рекомендации по использованию полученных результатов.** Результаты диссертационного исследования актуальны для изучения белорусской литературы в контексте мировой. Материалы научной работы могут быть использованы при дальнейшем изучении романтизма в литературе Беларуси, изучении истории белорусской и немецкой литератур, при подготовке учебников, курсов лекций и семинаров для старшеклассников и студентов филологических специальностей учреждений высшего образования, при написании курсовых и дипломных работ по белорусской и зарубежной (немецкой) литературе.

**Сфера применения.** Литературоведение (история литературы, теория литературы).

## SUMMARY

**Baturina Elena**

## FORMATION OF ROMANTIC PRINCIPLES IN 19TH CENTURY BELARUSIAN LITERATURE AND TRADITION OF GERMAN ROMANTICISM

**Key words:** romanticism, Belarusian literature, German literature, ballad, frame composition, Christianity, patriotism, Golden Age, music, folk song, fantasy.

**The aim of the research** is to find distinguishing features in the formation of romantic principles of reflecting reality in Belarusian literature of the 19th century and the role of the traditions of classical German literature in this process.

**The methods of the research.** Comparative-historical, cultural-historical, descriptive, elements of biographical and sociological methods.

**The results obtained and their novelty.** In this study, for the first time in Belarusian literary studies, the role of the most significant examples of German theoretical, aesthetic and fiction literature of the 18th–19th centuries in the formation of Romanticism in the 19th century literature of Belarus has been explored.. The role of German classical literature in the formation of romantic ballads and collections of stories with frame composition in Belarusian literature has been shown; common and distinctive features in typical romantic images created by Belarusian and German authors have been analyzed, artistic dominants of Belarusian literature of the 19th century with elements of romantic aesthetics have been identified.

**Recommendations for using the results obtained.** The results of the dissertation research are relevant for the study of Belarusian literature in the context of world literature. The materials of the scientific work can be used in further study of Romanticism in Belarusian literature, in the study of the history of Belarusian and German literature, in the preparation of textbooks, lecture courses and seminars for high school students and students of higher education institutions who major in philology, in writing term papers and diploma papers on Belarusian and foreign (German) literature.

**Recommendations for the use and sphere of application of the results obtained.** Literary studies (history of literature, theory of literature).

Падпісана да друку 18.03.2024. Фармат 60×84 1/16. Папера афсетная.
Рызаграфія. Ум. друк. арк. 1,63. Ул.-выд. арк. 1,75.
Тыраж 60 экз. Заказ 66.

Надрукавана з арыгінала-макета заказчыка
ў рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/63 ад 19.03.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.